**Болатава Ю.Г.,**
*аспірантка кафедры сацыялогіі і культуразнаўства*

# МЕНТАЛЬНАСЦЬ І КУЛЬТУРА: МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Праблема ментальнасці выйшла зараз на пярэдні край пошукаў у шэрагу замежных і айчынных навуковых школ, напрыклад у французскай "новай гістарычнай навуцы". Ментальнасць як паняцце Л.Феўрам і М.Блокам было запазычана ў Леві-Бруля. Але калі ён пад ментальнасцю разумеў "асаблівае пралагічнае мысленне" ў дзікуноў, то М.Блок і Л.Феўр прымянілі паняцце mentalite да настрою думак, складу розуму, калектыўнай псіхалогіі людзей у "гарачых грамадствах", якія знаходзяцца на стадыі цывілізацыі. Паняцце ментальнасці азначае наяўнасць у людзей таго ці іншага грамадства, якія належаць да адной культуры, пэўнага агульнага "разумовага інструментарыя", "псіхалагічнай аснасткі", што і дае ім магчымасць па-свойму ўспрымаць і асэнсоўваць сваё прыроднае і сацыяльнае акружэнне і саміх сябе. Хаатычны і разнародны паток успрыманняў і ўяўленняў перапрацоўваецца свядомасцю ў больш-менш упарадкаваную карціну свету, і гэты светапогляд накладвае моцны адбітак на ўсе паводзіны чалавека. Суб'ектыўны бок гістарычнага працэсу, спосаб мыслення і адчування, якія ўласцівы людзям пэўнай сацыяльнай, нацыянальнай або культурнай агульнасці, уключаецца ў аб'ектыўны гістарычны працэс.

Цяжка знайсці такую культурную крыніцу, якая б не несла на сабе адбітку ментальнасці стварыўшых яе людзей. Паколькі ўсё, што выйшла з рук чалавечых (фальклорная крыніца або выраб прыкладной дэкаратыўнай творчасці, музычны твор ці нешта іншае), створана з удзелам чалавечай псіхікі, то патрэбны адпаведныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“рэактывы”, каб выявіць рысы і асаблівасці ментальнасці. Даследчыка можа і не цікавіць ментальнасць сама па сабе, але веданне яе спецыфікі, сферы ўяўленняў, адносін да свету, звычак свядомасці, якія ўласцівы дадзенай культуры, ляжалі ў яе неўсвядомленай аснове, “падглебе”, і з’явіліся складанай часткай пры стварэнні вывучаемага намі аб’екта, так ці інакш у ім увасобіўшыся. Гэта абавязковая ўмова адэкватнай расшыфроўкі паслання, якое ў ім утрымліваецца.

Сказанае больш ці менш відавочна. Аднак падыход да вышэйзгаданых крыніц не як да бяздушнага артэфакта, а як да параджэння чалавечай псіхікі на практыцы ўсё яшчэ застаецца дастаткова спрэчным. Наша думка параней шаму знаходзіцца ў палоне ўяўленняў, уласцівых навукі XIX—XX стст. Старая пазітывісцкая навука зыходзіла з паняцця аб пасіўнай крыніцы, з якой даследчык можа выбіраць пераважна тую інфармацыю, што ляжыць на паверхні, напрыклад з хронікі — паведамленні пра падзеі і г.д. Мы былі схільны прыпадобніць сябе, па прызнанні Ш.Сеньёбаса, да “збіральнікаў ануч”: чым больш фактаў мы назапасім, тым хутчэй адкрыем нейкія законы, якія быццам бы самі сабою вынікаюць з гэтых фактаў.

Так, напрыклад, ісціна здавалася схаванай у тэкстах. “Тэксты, усё тэксты, нічога, апрача тэкстаў”, — усклікаў некалі Ф. дэ Куланж. А між тым Шэкспір, які апярэдзіў узнікненне знакавай канцэпцыі культуры, вуснамі Джульеты пытаўся: “What’s in a name? That which we call a rose by any other name would smell as sweet”. (“Што ў імені? Тое, што завём мы розай, і пад другою назвай захавала б салодкі водар”.)

Сучасная думка вылучае новы прынцып разумення, семіётыкі, герменеўтыкі і раскрыцця сэнсу, імпліцыраванага ў тэкстах. У аснове гэтага падыходу ляжыць ідэя, што веды, змешчаныя ў тэкстах, уяўляюць сабою важны элемент самасвядомасці грамадства, тую інтэлектуальную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

форму, у якой цывілізацыя ўсведамляе сваё мінулае, сённяшняе і нават будучае і, такім чынам, саму сябе.

Трэба сказаць, што для даследчыка адкрыты абодва шляхі. Вывучаючы ментальнасць, ён можа расчляняць тэкст, вылучаць з яго нейкія цікавыя яму элементы і спрабаваць "зазірнуць за тэкст", каб убачыць сацыяльна-псіхалагічную рэальнасць, якая схавана за ім і ў ім раскрываецца. Але ці не можа ён паспрабаваць выявіць унутраную сутнасць самога тэксту і ў яго структуры ўбачыць сімптомы калектыўных разумовых установак? Даследаванне, арыентаванае на дыялог паміж мінулым і сённяшнім, карэнным чынам мяняе ўсю сітуацыю.

"Адзін сэнс раскрывае свае глыбіні, сустрэўшыся і дакрануўшыся да іншага, чужога сэнсу: паміж імі пачынаецца нібыта дыялог, які выключае замкнёнасць і аднабаковасць гэтых сэнсаў, гэтых культур ... Пры такой дыялагічнай сустрэчы дзвюх культур яны не зліваюцца і не змешваюцца, кожная захоўвае сваё адзінства і адкрытую цэласнасць, але яны ўзаемна ўзбагачаюцца". Гэта ідэя, прапанаваная М.Бахціным, мае непасрэднае дачыненне да такога культуралагічнага падыходу, у цэнтры ўвагі якога — жыццё індывідуальных тэкстаў і раскрыццё заключанага ў іх сэнсу. Звяртаючы ўвагу на наватарства мысліцеля, паэта, мастака або музыканта, даследчыкі не надаюць належнай увагі крыніцам, якія адкрываюць новае ў паўсядзённым жыцці, грамадстве, побыце.

Тым не менш праблема вывучэння ментальнасці, духоўнага жыцця людзей на ўсіх яго ўзроўнях, ва ўсіх праявах — ад высокаінтэлектуальнай, лагічна прарэфлектаванай творчасці да цьмяных вобразаў і неасэнсаваных рэакцый — літаральна просіцца ў кола сучасных даследаванняў. Бачанне свету, характэрнае для дадзенай чалавечай супольнасці, натуральна, дыферэнцыраванае ў розных стратах,— неад'емны кампанент сацыяльнай сістэмы. Усе намеры людзей, усе стымулы іх грамадскіх паводзін, іх эканамічнай, палітычнай і культурна-творчай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці праходзяць праз іх свядомасць, трансфармуюцца ў ёй і атрымліваюць ад яе спецыфічную афарбоўку. І справа не вычэрпваецца дактрынамі, тэорыямі і наогул выразна сфармуляванымі, прайшоўшымі праз якасную свядомасць думкамі. За гэтым "выгавараным" і рацыянальным пластом свядомасці тоіцца цякучая магма неаформленых і невербалізаваных, але, тым не менш (або менавіта таму), у вышэйшай ступені "ўчэпістых" і ўстойлівых звычак думкі, афектыўных комплексаў.

Так, мы прызвычаіліся вывучаць сістэматызаваную думку інтэлектуалаў, а свядомасць шырокіх слаёў насельніцтва заставалася па-за межамі ўвагі. Між тым сёння грамадская свядомасць "чалавека з вуліцы" магутна ўрываецца ў кола даследаванняў. Таму зараз неабходна глыбокая пераацэнка значнасці розных катэгорый культурных крыніц, у тым ліку тых, што аказаліся ў забыцці.

Напрыклад, пры вывучэнні рэлігійнай псіхалогіі еўрапейцаў сярэднявечча і пачатку новага часу асаблівую важнасць (поруч з тэалагічнымі тэкстамі і афіцыйнымі дакументамі царквы) набываюць такія матэрыялы прыходскіх святароў, якія былі адрасаваны пастве і па прынцыпе "адваротнай сувязі" адлюстроўвалі яе погляды і настроі. Перанос цэнтра цяжару ў вывучэнні дэманаманіі і палявання на ведзьмаў з "вучоных" трактатаў на аналіз бясконцых судовых спраў, за якімі стаяць рэальныя чалавечыя лёсы і трагедыі, дазволіў па-новаму асвятліць істотныя аспекты праблемы і паказаць пэўныя рысы народнай культуры перыяду пераходу да новага часу. Высветлілася, што канкрэтны змест духоўнага жыцця народа аказаўся грунтоўна іншым утварэннем, чым першапачатковае евангельскае вучэнне або афіцыйнае багаслоўе. Метад пранікнення ў "падсвядомасць" культуры прынёс ужо нямала плёну: менавіта так удалося распазнаць культурныя вобразы дзяцінства, смерці, прасторы ва ўспрыманні людзей сярэднявечча і выявіць алагізмы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

парадоксы сярэдневяковай свядомасці, якія праліваюць святло на ўспрыманне імі часу і вечнасці.

Любая ідэя, што выходзіць за межы вузкага кола мысліцеляў, набывае незалежны лёс; сэнс вучэння пастаянна і непрыкметна мяняецца ў залежнасці ад сацыяльнага асяроддзя, дзе яно распаўсюджваецца, часу, патрабаванняў людзей і ўзроўню разумення. У апошнія гады назіраюцца кардынальныя зрухі адносна методыкі даследавання ментальнасці праз культурныя крыніцы. Даследчыкі больш не схільны давяраць непасрэдным выказванням людзей, іх суб'ектыўнаму, а таму тэндэнцыйнаму, бачанню. Яны аддаюць перавагу ўскосным сведчанням, выяўленню імпліцытных ацэнак і міжвольна выказаных поглядаў і ўяўленняў, тым аспектам светасузірання, якія хутчэй маюць дачыненне да "плана зместу", чым да "плана выказвання", і цэняць тыя выпадкі, калі вывучаемая культура "прагаворваецца" пра такія таямніцы, пра якія сама не здагадвалася. Прыгадаем яшчэ раз М.Бахціна: "Мы ставім перад іншай культурай новыя пытанні, якіх яна сама сабе не ставіла, і іншая культура адказвае нам, адкрываючы перад намі новыя свае бакі, новыя сэнсавыя глыбіні".

**Макараў У.М.,**
*аспірант кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*

## КАШТОЎНАСНЫЯ АРЫЕНТАЦЫІ МОЛАДЗІ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Шматлікія навукоўцы і даследчыкі лічаць найбольш важнай сучаснай задачай распрацоўку парадыгмы актыўнага духоўнага здароўя са зменай яе на карысць сістэмы матывацый і каштоўнасных арыентацый людзей. Размова ідзе аб тым, што дзеля жыцця чалавека важна не